# Нашы юбіляры

## МІХАІЛ ЯЎГЕНАВІЧ ЦІКОЦКІ



Споўнілася 70 гадоў беларускаму вучонаму і журналісту, доктару філалагічных навук, прафесару Міхаілу Яўгенавічу Цікоцкаму.

М. Я. Цікоцкі нарадзіўся 20 лютага 1922 г. у горадзе Бабруйску ў сям'і кампазітара Яўгена Карлавіча Цікоцкага. У 1933 г. іх сям'я пераехала на пастаяннае жыхарства ў Мінск. Тут ён вучыўся і закончыў сярэднюю школу ў 1941 г. Пачалася вайна, наступілі цяжкія і суровыя часы ваеннага ліхалецця і выпрабаванняў. Да 1943 г. Міхаіл Яўгенавіч знаходзіўся на акупіраванай тэрыторыі, а затым разам з маці і сястрой быў пераpraўлены партызанамі ў Маскву. З восені 1943 г. знаходзіўся ў радах Савецкай Арміі, ваяваў на 1-м, 2-м і 3-м Беларускім франтах. Летам 1944 г. пад Кобрынам быў паранены.

Пасля дэмабілізацыі М. Я. Цікоцкі паступіў вучыцца на факультэт журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна, які і закончыў у 1950 г. Плённа, з юнацкім запалам і захапленнем працаваў нейкі час у рэдакцыях газет «Савецкі селянін» і «Калгасная праўда». Адначасова вучыўся ў завочнай аспірантуры пры кафедры тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі, паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Публіцыстыка Якуба Коласа».

З 1953 г. М. Я. Цікоцкі працуе на факультэце журналістыкі спачатку ў якасці выкладчыка, дацэнта кафедры тэорыі і практыкі савецкага друку, а пазней (з 1965 г.) яе загадчыкам. Пасля стварэння кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання (кастрычнік 1969 г.) выбіраецца загадчыкам гэтай кафедры, на якой паспяхова працуе і зараз. У 1972 г. абараніў доктарскую дысертацыю на тэму «Праблемы публіцыстычнага стылю», а праз год быў зацверджаны ў навуковым званні прафесара.

М. Я. Цікоцкі чытае курсы лекцый па стылістыцы беларускай мовы і стылістыцы газетных жанраў, вядзе спецсемінар па эстэтыцы слова. Яго лекцыі вызначаюцца змястоўнасцю, глыбінёй тэарэтычных абагульненняў, творчай праніклёнасцю, даступнасцю выкладу матэрыялаў і слухаюцца студэнтамі з вялікай цікавасцю і ўвагай.

Надзвычай плённа вядзе Міхаіл Яўгенавіч і навуковыя даследаванні. Ён аўтар васьмі манаграфій, вучэбных дапаможнікаў і падручнікаў: «Некаторыя выпадкі стылістычнага выкарыстання сінтаксічных сродкаў беларускай мовы» (1958); «З гісторыі беларускай журналістыкі XIX стагоддзя» (1960); «Практычная стылістыка беларускай мовы» (Ч. 1. 1962, Ч. 2. 1965); «У. І. Ленін і пытанні эстэтыкі публіцыстычнага слова» (1968); «Стылістыка публіцыстычных жанраў» (1971); «Стылістыка беларускай мовы» (1976). У 1981 г. выйшла яго кніга нарысаў па стылістыцы мастацкай мовы «Сугучнасць слоў жывых», якая атрымала ўсеагульнае прызнанне.

Навуковую і педагагічную дзейнасць М. Я. Цікоцкі спалучае з актыўнай грамадскай працай. Як член Саюза журналістаў СССР, ён актыўна ўдзельнічае ў рабоце яго секцый, выступае ў розных аўдыторыях з лекцыямі па праблемах культуры мовы і стылістыкі газетных жанраў. Пры актыўным удзеле прафесара М. Я. Цікоцкага на кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання праводзіцца вялікая работа па вывучэнні мовы і стылю сродкаў масавай інфармацыі, разгортванні студэнцкіх навуковых даследаванняў. Ён адзін з рэдактараў перыядычнага кафедральнага зборніка «Культура мовы журналіста».

Ратныя і працоўныя заслугі М. Я. Цікоцкага адзначаны двума медалямі «За адвагу», Граматай Вярхоўнага Савета БССР і Ганаровым знакам Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР «За выдатныя поспехі ў рабоце».

Міхаіл Яўгенавіч поўны творчых сіл, смелых задум і планаў на будучае. Мы, яго калегі, сябры, віншуючы юбіляра, жадаем яму моцнага здароўя, бадзёрасці, шчаслівага жыцця, вялікага творчага плёну.

**А. І. Наркевіч**